# ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭЛЕГАТАМ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНАГА РАЁНА!


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 38 (487) | Чацвер, 24 снежня 1981 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


«...Ленінскі камсамол, павышаючы актыўнасць, дысцыпліну і арганізаванасць сваіх радоў, памножыць свой уклад у справу камуністычнага выхавання моладзі, паспяховага ажыццяўлення гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, заўсёды будзе надзейным памочнікам і баявым рэзервам роднай Камуністычнай партыі».

(З даклада першага сакратара ЦК ВЛКСМ Б. М. ПАСТУХОВА на IX пленуме ЦК ВЛКСМ).

## УПЭЎНЕНЫ ПОСТУП

**У. БІРАН, першы сакратар Цэнтральнага РК ЛКСМБ**

★

28-тысячны атрад камсамоліі Цэнтральнага раёна г. Гомеля падышоў да чарговай XXII раённай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі з новымі поспехамі і дасягненнямі.

Раённы камітэт камсамола, пярвічныя камсамольскія арганізацыі галоўную ўвагу ў справаздачны перыяд сканцэнтроўвалі на канкрэтным удзеле кожнага камсамольца ў выкананні вытворчых задач. Справай адказваючы на рашэнні XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, камсамольцы шырока падтрымалі ініцыятыву дэлегатаў XXVI з'езда КПСС В. Л. Шварова і Н. А. Аляксеенка па датэрміновому выкананню заданняў першага года адзінаццатай пяцігодкі. 353 маладыя працаўнікі раёна і 11 камсамольска-маладзёжных калектываў рапартавалі аб датэрміновым завяршэнні гадавога задання да 7 лістапада.

Жывы водгук у сэрцах і справах камсамольцаў раёна, як і ўсёй савецкай моладзі, знайшла пастанова IX пленума ЦК ВЛКСМ аб скліканні чарговага XIX з'езда ВЛКСМ. На сваіх справаздачна-выбарных сходах камсамольцы ўзялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы вышэйшага форуму камсамола краіны.

Камсамольска-маладзёжная брыгада наладчыкаў станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава (брыгадзір А. Селіх, камсорг В. Левянкоў) выступіла з ініцыятывай: «Заданне двух гадоў пяцігодкі — да дня адкрыцця XIX з'езда ВЛКСМ». Камсамольска-маладзёжныя калектывы завода вымяральных прыбораў і будаўнічага трэста № 14 працуюць пад дэвізам: «План першага паўгоддзя другога года пяцігодкі — да дня адкрыцця XIX з'езда ВЛКСМ». На працоўнай вахце «XIX з'езду ВЛКСМ — 19 ударных дэкад» сёння камсамольска-маладзёжныя калектывы аб'яднанняў «Прамтавары», «Прадтавары», трэста сталовых, рэстаранаў і кафэ.

У справаздачны перыяд асаблівая ўвага ўдзялялася ўдасканальванню работы камсамольска-маладзёжных фарміраванняў. Іх колькасць павялічылася амаль удвая, у саставе якіх цяпер працуе звыш чатырох тысяч чалавек.

Ударная праца, строгае захоўванне дысцыпліны, смеласць тэхналагічных рашэнняў, пошук і эксперымент — такія неад'емныя рысы лепшых камсамольска-маладзёжных калектываў раёна. Сярод іх — калектыў імя 60-годдзя ЛКСМБ участка друкаваных плат завода вымяральных прыбораў (брыгадзір А. Пярова, камсорг А. Крапасная), імя XXVI з'езда КПСС магазіна № 38 аб'яднання «Прамтавары» (кіраўнік Л. Палавец, камсорг З. Курака), камсамольска-маладзёжная брыгада тынкоўшчыкаў трэста № 14 (брыгадзір М. Чубукова, камсорг Л. Караткевіч).

Выконваючы рашэнні VIII пленума ЦК ВЛКСМ, у раёне разгарнуўся агляд работы пярвічных камсамольскіх арганізацый па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС. На першым этапе агляду, які праходзіў сярод 9 катэгорый арганізацый, пераможцамі прызнаны камсамольскія арганізацыі завода вымяральных прыбораў, тэлефонна-тэлеграфнай станцыі, аблкнігагандлю, Беларускага навукова-даследчага геолага-разведачнага інстытута, абласной канторы Дзяржбанка, камсамольскіх арганізацый настаўнікаў СШ № 10 і № 26, машынабудаўнічага тэхнікума, абласной дзіцячай бальніцы.

Канкрэтныя задачы стаяць перад камітэтамі камсамола раёна па далейшаму развіццю навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. Вялікую ролю ў развіцці навукова-тэхнічнага прагрэсу, ва ўмацаванні сувязі навукі з вытворчасцю выконваюць камсамольскія арганізацыі НДІ і праектна-канструктарскіх інстытутаў, прамысловых прадпрыемстваў. Навукова-тэхнічнай творчасцю ў раёне займаецца звыш 5 тысяч камсамольцаў і моладзі, з іх 986 — рацыяналізатары і вынаходнікі. Эфект рацпрапаноў, пададзеных моладдзю за апошнія два гады, складае 1,5 мільёна рублёў. На VIII пленуме райкома камсамола станоўчую ацэнку атрымала дзейнасць у гэтым напрамку камсамольскіх арганізацый геолага-разведачнага інстытута і Інстытута механікі металапалімерных сістэм.

У справаздачны перыяд райком камсамола накіроўваў дзейнасць пярвічных камсамольскіх арганізацый на ўзмацненне работы па камуністычнаму выхаванню моладзі. Працягвалася ўдасканальванне структуры камсамольскай палітычнай вучобы. У параўнанні з 1978 годам колькасць удзельнікаў школ і семінараў палітвучобы ўзрасла больш чым на 11 працэнтаў. Цяпер больш 9 тысяч маладых людзей займаецца ў школах камсамольскай палітвучобы, эканамічнай адукацыі. Палепшыўся якасны састаў прапагандысцкіх кадраў.

Палепшылася лекцыйная прапаганда. Істотных поспехаў у гэтым напрамку дасягнулі камітэты камсамола аб'яднання «Прамтавары», Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, вытворчага аб'яднання «Камінтэрн».

Разам з райспорткамітэтам, райкомам ДТСААФ, РК ЛКСМБ удзяляў пастаянную ўвагу фізічнаму выхаванню моладзі. Студэнт ГДУ М. Кіраў стаў прызёрам XXII Алімпійскіх гульняў у Маскве, выпускніца школы-інтэрната спартыўнага профілю Алена Палявая выходзіла пераможцай буйных міжнародных спаборніцтваў, у саставе зборнай каманды СССР сёлета стала чэмпіёнкай свету па гімнастыцы.

Развіваецца і масавы спорт. Толькі ў бягучым годзе ў спаборніцтвах на прызы газеты «Комсомольская правда» прынялі ўдзел 15 тысяч юнакоў і дзяўчат. На належным узроўні сумесная работа камітэтаў камсамола з саветамі калектываў фізкультуры ў аб'яднанні «Камінтэрн», у будтрэсце № 14, на фабрыцы «8 Сакавіка».

Эфектыўнай формай працоўнага выхавання, маральнай загартоўкі студэнтаў сталі студэнцкія атрады. У працоўным семестры-81 навучальнымі установамі Цэнтральнага раёна было сфарміравана 73 атрады агульнай колькасцю 2486 чалавек. Вялікую арганізацыйную работу па фарміраванню студэнцкіх атрадаў правялі камітэты камсамола ГДУ, дарожна-будаўнічага і машынабудаўнічага тэхнікумаў.

Задача камсамольскіх арганізацый раёна — працаваць так, каб быць надзейнымі памочнікамі партыйных арганізацый па мабілізацыі калектываў на ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, дастойна сустрэць XIX з'езд ВЛКСМ.

## Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Леанід Ільіч Брэжнеў



## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

### Аб узнагароджанні Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Маршала Савецкага Саюза таварыша БРЭЖНЕВА Леаніда Ільіча ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза

За выдатныя заслугі перад Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай у справе ўмацавання эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза, вялікі асабісты ўклад у дасягненне перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднаўленне і далейшае развіццё народнай гаспадаркі СССР у пасляваенны перыяд, нястомную дзейнасць у барацьбе за мір, за плённае кіраўніцтва камуністычным будаўніцтвам і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Маршала Савецкага Саюза таварыша **Брэжнева Леаніда Ільіча ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза.**

**Першы намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР В. КУЗНЯЦОЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль. 18 снежня 1981 г.

**СЛОВА — ДЭЛЕГАТАМ**

## ІМКНУЦЦА ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ

Ужо дзесяць гадоў я працую на фабрыцы «8 Сакавіка». Прафесія вязальшчыцы мне вельмі падабаецца. Даўно прывыкла і да свайго калектыву, які даў мне пуцёўку ў жыццё. Дзякуючы яму я рэгулярна дабіваюся значных поспехаў. Неаднаразова мне прысвойвалі званне «Лепшы па прафесіі». Сёлета я заняла першае месца ў рэспубліканскім конкурсе рабочага майстэрства маладых вязальшчыц.

Большага гонару, як працаваць і аддаваць свае веды і ўменне людзям, я не ведаю. Таму да работы адношуся з усёй сур'ёзнасцю. У гэтым годзе камсамольцы фабрыкі аказалі мне высокае давер'е: выбралі членам камітэта камсамола. Усімі сваімі справамі буду імкнуцца апраўдваць яго.

Я жадаю дэлегатам раённай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі прынцыпова абмеркаваць сваю работу, смела ўскрываць недахопы, вызначаць шляхі іх ухілення, каб у будучым дасягнуць яшчэ больш высокіх працоўных паказчыкаў.

**Н. РЫБАК, вязальшчыца фабрыкі «8 Сакавіка», дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.**

# ЗДОЛЕЕШ АСІЛІЦЬ ЛЮБЫЯ РУБЯЖЫ

## НА ПЕРАДЗ'ЕЗДАЎСКАЙ УДАРНАЙ ВАХЦЕ

Камсамольцы і моладзь будаўнічага трэста № 14 заступілі на ўдарную вахту па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ. У нашым трэсце працуе 18 камсамольска-маладзёжных калектываў. Яны ўносяць дастойны ўклад у выкананне планаў адзінаццатай пяцігодкі. Неаднаразова камсамольска-маладзёжныя калектывы выступалі ініцыятарамі патрыятычных пачынаў. Сваімі дасягненнямі радуюць яны і цяпер. Камсамольска - маладзёжная брыгада тынкоўшчыкаў (брыгадзір А. Гладзіна, групкамсорг Л. Лісічкіна) абавязалася заданне двух кварталаў будучага года выканаць да дня адкрыцця XIX з'езда ВЛКСМ. Камітэт камсамола адобрыў гэту ініцыятыву і прапанаваў падтрымаць яе ва ўсіх камсамольска-маладзёжных брыгадах.

Сярод камсамольцаў і моладзі нашага трэста разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 60-годдзя з дня ўтварэння СССР. Дастойны ўклад у працоўныя справы трэста уносяць лепшыя камсамольцы: тынкоўшчыкі Л. Лісічкіна, В. Кухарава, пліточнік Г. Траццякоў, муляр А. Кузняцоў, слесар А. Залатароў і многія іншыя.

Мы не толькі плённа працуем, але і ўмеем добра адпачываць. Рэгулярна праводзім тэматычныя вечары, «Агеньчыкі», дыскатэкі. Пры інтэрнаце № 13 арганізаваны клуб па інтарэсах «Сяброўка».

Добрыя ў нас і спартыўныя дасягненні. Спорт мы лічым лепшым адпачынкам. Нашы каманды займаюць прызавыя месцы на раённых, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Нядаўна ў нас як і паўсюдна, прайшла справаздачна-выбарная кампанія. Яшчэ больш адказныя задачы мы паставілі перад камсамольцамі трэста. Прыкладзём усе намаганні, каб паспяхова справіцца з імі.

**У. ЮРЧАНКА,**
**сакратар камітэта камсамола будаўнічага трэста № 14.**

* * *

Паўсюдна шырокую падтрымку па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ атрымалі патрыятычныя пачынанні камсамольска-маладзёжных калектываў, маладых працаўнікоў вытворчасці Масквы, Ленінграда, Украіны, Беларусі, Чэлябінскай і Яраслаўскай абласцей. Мы ўзялі раўненне на камсамольска - маладзёжны калектыў магазіна № 38 аб'яднання «Прамтавары», які працуе пад дэвізам «XIX з'езду ВЛКСМ — 19 ударных дэкад».

Камсамольская ўдарная вахта ў нас пачалася з першага лістапада. Кожную дэкаду падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, якія адлюстроўваюцца на спецыяльна афармленым экране. Лепшаму камсамольцу ўручаецца пераходны вымпел з надпісам: «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ». Першымі пераможцамі сталі камсамолкі Яўмененкава і Фёдарава.

**В. ЛЯДКОВА,**
**сакратар камсамольскай арганізацыі універмага.**

## ЦЭНТР КАМСАМОЛЬСКАЙ РАБОТЫ

У 1978 ГОДЗЕ мы, выпускнікі васьмых класаў, паступілі ў Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум імя Ленінскага камсамола Беларусі. Сёння мы задумваемся, што вельмі хутка праляцелі гады вучобы. Праз два месяцы тэхнікам-будаўнікам, да якіх адношуся, давядзецца ехаць на будоўлі народнай гаспадаркі. Чаму мы навучыліся за гады вучобы, што спазналі, стане бачна дакладна і ясна.

Вучоба — гэта пачатак працоўнай дзейнасці чалавека. Ад таго, як навучэнец цэніць свой час, наколькі актыўны ў вучобе, у канчатковым выніку залежыць узровень яго падрыхтоўкі як спецыяліста, майстра сваёй справы.

Н. К. Крупская гаварыла: «Веды патрэбны ў жыцці, як вінтоўка ў баі». Добрая вучоба кожнага навучэнца магчыма толькі ў абстаноўцы творчасці, прынцыповасці, узаемадапамогі.

Наша група ДБ-41 стала сапраўдным калектывам, у якім жывуць аднымі мэтамі, кожны гатовы дапамагчы таварышу. У нас не бывае так, каб чыісці дрэнны учынак застаўся незаўважаным. Рабяты не дазволяць абыякава адносіцца да вучобы, непрыстойна паводзіць сябе ў тэхнікуме і за яго сценамі.

Прыкладам для нас з'яўляюцца выдатнікі вучобы Л. Навумчык, Н. Самусенка, І. Стрыжанок, а таксама актывісты І. Новікаў, Г. Зайцава, В. Куляшова, Т. Барысевіч. У нашай камсамольскай групе стала традыцыяй праводзіць камсамольскія сходы на тэмы: «Як ты выконваеш абавязкі камсамольца?», «Для чаго мы вучымся?» Арганізавана індывідуальнае шэфства над адстаючымі, з імі праводзяцца дадатковыя заняткі.

У прыватнасці, Ігар Санчук пачаў адставаць па адной з вучэбных дысцыплін. На дапамогу яму прыйшла Ларыса Навумчык. Праз месяц Ігар стаў атрымліваць добрыя адзнакі.

Аналагічная сітуацыя склалася і ў Ані Лобавай. Шэфства над ёй узяла Надзя Савянкова. І справа пайшла на лад.

Камітэт камсамола важную ролю надае сацыялістычнаму спаборніцтву паміж групамі. Яно абуджае ініцыятыву, садзейнічае станаўленню калектыву, яго развіццю. Мы прымаем сацыялістычныя абавязацельствы ў групах на аснове асабістых комплексных планаў камсамольцаў — удзельнікаў Ленінскага заліку. Улічваецца шырокае кола пытанняў вучэбнага калектыву: мабілізацыя камсамольцаў на глыбокае і творчае авалодванне марксісцка-ленінскай тэорыяй барацьбы за высокую якасць ведаў, прафесіянальную падрыхтоўку, удзел у тэхнічнай творчасці, грамадска-карысная праца, авалодванне навыкамі арганізатара, кіраўніка.

Усе разумеюць, што ні адзін падручнік не заменіць кароткага, але вычарпальнага расказа выкладчыка. Вось чаму мы ставім задачай камсамольскай арганізацыі не дапускаць ніводнай гадзіны пропускаў заняткаў без уважлівай прычыны. Калі хто-небудзь і прапусціць заняткі, камсамольцы спытаюць за гэта з усёй строгасцю.

Цяпер у сярэдняй спецыяльнай школе ідзе працэс фарміравання ўсебакова і гарманічна развітай асобы. Выконваючы рашэнні XVIII з'езда ВЛКСМ, асаблівую ўвагу мы надаём духоўнаму і фізічнаму ўдасканальванню навучэнцкай моладзі. На класных гадзінах, у экскурсіях, пры сустрэчах з цікавымі людзьмі, на суботніках, спартыўных спаборніцтвах юнакі і дзяўчаты праходзяць школу працоўнай і палітычнай загартоўкі, маральнай сталасці, развіваюцца эстэтычна і фізічна. У нашай групе ёсць здольныя спартсмены: Н. Самусенка, І. Стрыжанок. Яны абараняюць гонар тэхнікума на розных спаборніцтвах. Па выніках агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу наша група заняла другое месца.

Ёсць у нас і не вырашаныя пытанні. Пры праходжанні вытворчай практыкі губляецца кантакт з камітэтам камсамола, не заўсёды ясна і дакладна ставяцца задачы па грамадска-палітычнай практыцы.

**Л. ДРАБЫШЭЎСКАЯ,**
**навучэнка гр. ДБ-41 Гомельскага дарожна-будаўнічага тэхнікума, ленінская стыпендыятка, кандыдат у члены абкома камсамола.**



На здымку: дэлегат канферэнцыі В. Новікава з атэлье «Дом быту». Зменныя нормы яна выконвае на 160 працэнтаў і працуе ўжо ў лік 1982 года.

## ЗМЕНА РАБОЧАМУ КЛАСУ

Гомельскае тэхнічнае вучылішча — 30 рачнога флоту — адно са старэйшых у рэспубліцы. За сорак гадоў з яго сцен выйшлі тысячы класных спецыялістаў для рачнога флоту і іншых галін народнай гаспадаркі.

Мне хочацца расказаць пра сваю вучэбную групу № 4. Сёлета яна плённа папрацавала на сельгасработах у калгасе «Рассвет» Кармянскага раёна. Час знаходжання ў гэтай гаспадарцы стаў экзаменам для кожнага з нас. Кожны тыдзень рэдкалегія групы выпускала «баявыя лісткі», у якіх адлюстроўваліся нашы працоўныя справы, адпачынак. За стараннасць на бульбяных палетках, прыкладныя паводзіны наша група ўзнагароджана Ганаровай граматай праўлення калгаса. Такой жа ўзнагароды ўдастоіліся лепшыя камсамольцы Я. Трыбух, А. Крантоўскі, М. Надтачаеў, В. Сніпіч, аўтар гэтых радкоў.

Пасля працоўнага экзамена ў нас пачалася тэарэтычная падрыхтоўка. Мы прыкладаем усе намаганні для пазнання раней нам не вядомых, даволі цікавых прадметаў.

У вучылішчы праводзіцца шмат культурна-масавых мерапрыемстваў, у якіх наша група прымае самы актыўны ўдзел. Нядаўна адбыўся агляд-конкурс на лепшае выкананне камсамольска-маладзёжнай песні, у якім мы занялі першае месца.

Кожную пятніцу ў групе праводзяцца палітінфармацыі. Іх рыхтуюць самі навучэнцы. Усе мы з цікаўнасцю займаемся ў гуртках тэхнічнай творчасці і ў спартыўных секцыях.

Праз чатыры месяцы мы адправімся на плаўпрактыку і будзем непасрэднымі ўдзельнікамі выканання народнагаспадарчых планаў адзінаццатай пяцігодкі. Для таго, каб добрасумленна, з гонарам выконваць гэту задачу, імкнемся вучыцца толькі на «добра» і «выдатна». Заданне плаўпрактыкі мы абавязаліся выканаць на 102 працэнты, не дапусціць ні аднаго выпадку парушэння вучэбнай і вытворчай дысцыпліны.

**В. ТКАЧОЎ,**
**стараста гр. № 4 Гомельскага ТВ-30.**

## НАШ КЛОПАТ — ПАДЛЕТАК

Асабліва значэнне сёння набывае барацьба з правапарушэннямі, якія здараюцца сярод моладзі. Папярэджанне такіх з'яў для нас — адна з важнейшых задач выхавання моладзі ў духу высокіх прынцыпаў камунізму. У прафілактычнай рабоце з непаўналетнімі і моладдзю райком камсамола бачыць перш за ўсё далейшае развіццё працоўнай і грамадскай актыўнасці, прапагандуем савецкі лад жыцця і заканадаўства. Робім гэта сумесна з органамі ўнутраных спраў у адпаведнасці з папярэдне складзеным комплексным планам. План распрацаваны і прыняты гаркомам ЛКСМБ, гарвыканкомам і ўпраўленнем унутраных спраў аблвыканкома. У практычнай дзейнасці райкома камсамола трывала зацвердзілася планаванне работы па прафілактыцы і папярэджанню правапарушэнняў сярод непаўналетніх і моладзі, штоквартальны аналіз стану аператыўнай абстаноўкі, узаемнае інфармаванне аб негатыўных з'явах у маладзёжным асяроддзі і мерах, якія прымаюцца. Найбольшы эфект камсамольскага ўздзеяння мы атрымліваем ад дзейнасці аператыўных камсамольскіх атрадаў дружыннікаў. Зараз у раёне налічваецца 150 членаў такіх дружын. Асноўны напрамак у іх дзейнасці займае прафілактычная работа. За 9 месяцаў 1981 года дружыннікі правялі 21 рэйд, у тым ліку па папярэджанню безнагляднасці — 9. У ходзе рэйдаў было выяўлена 9 непаўналетніх, якія маюць схільнасць да правапарушэнняў. 27 падлеткаў пастаўлены на прафілактычны ўлік, з іх 25 працаўладкавана, а 2 зноў вучацца ў школе.

Сумесна з органамі ўнутраных спраў праведзены мэтавыя рэйды пад умоўнымі назвамі «Падлетак», «Адтэрміноўка». Актывізацыі права-выхаваўчай работы ў раёне садзейнічала правядзенне аперацыі «Клопат-81». За час яе правядзення ў лагеры старшакласнікаў, лагеры працы і адпачынку, школьныя рамонтна-будаўнічыя, школьныя вытворчыя брыгады і іншыя вытворчыя аб'яднанні было прыцягнута за лета 230 падлеткаў. У студэнцкіх будаўнічых атрадах працавала 25 падлеткаў. У ходзе гэтай жа аперацыі было выяўлена 12 падлеткаў, якія не вучацца і не працуюць. З іх 5 было працаўладкавана, 7 працягваюць заняткі ў школе.

У апошні час шырокае распаўсюджанне атрымала замацаванне аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў за канкрэтным участкам або аб'ектам. Эфектыўна працуюць аператыўныя камсамольскія атрады Гомельскага суднабудаўнічага - суднарамонтнага завода (камандзір Віктар Кулебін), завода вымяральных прыбораў (камандзір Міхаіл Семянцоў).

Уся гэтая работа дала свой плён: колькасць злачынстваў, якія зроблены падлеткамі ў гэтым годзе ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, зменшылася на 9,2 працэнта. Але нас гэта, зразумела, не можа задавальняць, і таму, як нам бачыцца, работа ў гэтым напрамку прадстаіць яшчэ вялікая. Пастанова Цэнтральнага Камітэта КПСС «Аб паляпшэнні работы па ахове правапарадку і ўзмацненні барацьбы з правапарушэннямі» патрабуе ад камітэтаў камсамола значна павысіць іх ролю ў папярэджанні правапарушэнняў.

**Т. РОСЛІКАВА,**
**другі сакратар Цэнтральнага РК ЛКСМБ.**

## НА ПЕРАДЗ'ЕЗДАЎСКАЙ УДАРНАЙ ВАХЦЕ

Як баявую праграму сваёй дзейнасці, прынялі рашэнні XXVI з'езда КПСС у нашым камсамольска-маладзёжным калектыве павароў сталовай № 76. Мы накіроўваем усе намаганні на хутчэйшае ператварэнне іх у жыццё. Гэта дазваляе штомесяц перавыконваць план па тавараабароту. Выпрацоўка прадукцыі ў разліку на аднаго работніка ў нашай брыгадзе складае 1760 рублёў пры сярэднетрэстаўскай — 1215.

Наш калектыў працуе пад дэвізам: «Адказнасць кожнага — за кожнага». Гэта не проста ідэйна сфармуляваная фраза. Мы сапраўды ў адказе за кожнага.

Па выніках работы за 1980 год брыгадзе прысвоена ганаровае званне «Брыгада камуністычнай працы». Кожны яе член удзяляе ўвагу пастаяннаму павышэнню свайго прафесіянальнага ўзроўню. Шэсць чалавек займаюцца ў школе кулінарнага майстэрства, усе астатнія члены брыгады — у школе эканамічнай адукацыі.

У гонар XIX з'езда ВЛКСМ калектыў нашай брыгады абавязаўся датэрмінова выканаць план бягучага года, а пяці месяцаў наступнага — да дня адкрыцця камсамольскага форуму краіны.

**Т. ДЗЯМ'ЯНАВА,**
**член камсамольска-маладзёжнага калектыву павароў сталовай № 76.**

* * *

У авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва на нашым аўтарамонтным заводзе ідзе калектыў цэха № 2. Вялікі ўклад у выкананне планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў уносяць камсамольцы. Прадукцыйнасць працы кожнага з іх перавышае сярэднюю па заводу. Камсамольцы В. Кліновіч, А. Казубоўскі, С. Мярышчэнка працуюць ужо у лік студзеня, а В. Перацятчанка, М. Кір'янаў — у лік лютага наступнага года. На маім працоўным календары ўжо сакавік 1982 года.

**А. АРОНАЎ,**
**сакратар камсамольскага бюро цэха № 2 аўтарэмзавода.**

*ШКОЛА*

## З ЗАПАЛАМ МАЛАДЫХ СЭРЦАЎ

Піянерская дружына нашай школы носіць імя Героя Савецкага Саюза Аляксандра Матросава. Мэтанакіравана арганізоўваць яе работу нам дапамагае Усесаюзны марш. У ходзе яго ў нас зарадзіліся сапраўды змястоўныя, напоўненыя вялікім ідэйным зместам і значэннем справы.

Сярод многіх маршрутаў марша адным з найбольш адказных і складаных з'яўляецца маршрут «У краіну ведаў». За апошнія 11 гадоў у дружыне не было другагоднікаў. Выпрабаванымі, традыцыйнымі формамі выхавання ў піянераў цікавасці да заняткаў у школе сталі прадметныя і творчыя гурткі, алімпіяды юных фізікаў, матэматыкаў, гісторыкаў і г. д. У нас актыўна дзейнічаюць пасты ўзаемадапамогі. На справаздачна-выбарным зборы дружыны пераможцам алімпіяд уручаюцца стужкі і кніжкі-пасведчанні «Лепшаму фізіку», «Лепшаму матэматыку» і г. д., а піянерам, якія прыйшлі да галоўнага збора дружыны толькі з пяцёркамі, уручаюцца ганаровыя стужкі «Выдатніку вучобы».

Высокая паспяховасць у школе, глыбокія і трывалыя веды рабят у немалой ступені з'яўляюцца вынікам супрацоўніцтва школы і падшэфнай фабрыкі «8 Сакавіка». Сувязь з ёй дапамагае школе рэалізоўваць пастаўленыя XXVI з'ездам КПСС патрабаванні па ўмацаванню кантактаў школы з вытворчасцю. Амаль трыццацігадовая дружба двух калектываў пачалася з прыходу ў школу важатых з вытворчасці. Затым жыццё падказала неабходнасць работы калектыўнага важатага, калі брыгада шэфствуе над піянерскім атрадам, і паміж імі вядзецца спаборніцтва пад дэвізам: «Брыгада —без брака, клас — без двоек».

Цяпер у піянерскіх атрадах нашай дружыны працуе 20 важатых з вытворчасці. Некалькі гадоў таму назад прыйшла ў піянерскі атрад 4 «Г» класа работніца фабрыкі Зоя Навуменка. З таго дня яна не расстаецца з рабятамі. Колькі добрага, цікавага падарыла Зоя сваім выхаванцам! Любяць яе дзеці, паважаюць настаўнікі.

Многа выдатных традыцый склалася за гады сумеснага супрацоўніцтва фабрыкі і школы: злёты трох пакаленняў, святы «На памяць школе», працоўныя вахты старэйшых піянераў у цэхах фабрыкі на працягу ўсяго года. Такім чынам мы выхоўваем у піянераў павагу да людзей працы, да слаўных традыцый рабочага класа, развіваем цікаўнасць да прафесій.

Не толькі рабочыя фабрыкі, а і студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта сталі актыўнымі членамі педатрада «Таварыш» пры нашай школе. Сярод іх — Л. Галькіна, В. Мякіш, Г. Лоечка, Л. З'янава, З. Лубская, С. Перын, С. Гуляеў, Л. Плыгаўка. Адны з іх з'яўляюцца важатымі ў піянерскіх атрадах, другія — шэфамі цяжкавыхоўваемых падлеткаў.

У дні падрыхтоўкі да 60-годдзя піянерскай арганізацыі мы чакаем ад іх дапамогі ў арганізацыі цікавых піянерскіх спраў: збораў, сустрэч, паходаў, экскурсій.

Нашы піянеры не застаюцца ў баку і ад важных палітычных кампаній. Разам з камсамольцамі яны сабралі 13 тон макулатуры і 7 тон металалому, а атрыманыя за іх сродкі ў суме 375 рублёў пералічылі ў Фонд міру.

**Н. ЖУК,**
**старшая піянерважатая школы № 10.**

## ПРАЦАВАЦЬ З НАЙВЫШЭЙШАЙ АДДАЧАЙ

Камсамольская арганізацыя Гомельскага філіяла інстытута «Белкалгаспраект» нясе працоўную вахту ў гонар XIX з'езда ВЛКСМ. У кожнага з нас глыбокае асэнсаванне знайшлі словы таварыша Л. І. Брэжнева: «Цяперашняя дэмаграфічная сітуацыя патрабуе лепш выкарыстоўваць працоўныя рэсурсы». Я лічу, што іх рацыянальнае выкарыстанне — гэта праца з найвышэйшай аддачай. Для многіх нашых камсамольцаў такія адносіны да службовых абавязкаў сталі нормай. Групы праектавання аўтаматыкі і тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў рапартавалі аб завяршэнні заданняў першага года адзінаццатай пяцігодкі да першага снежня. Камсамольцы А. Давыдава, А. Ячкула і А. Паўлоўская паказваюць прыклад у працы.

У нашым калектыве да гадавіны Вялікага Кастрычніка былі падведзены вынікі руху «За камуністычную працу». 14 камсамольцаў цяпер носяць ганаровае званне ўдарніка камуністычнай працы.

Моладзь філіяла праектнага інстытута актыўна ўдзельнічае ў сацыялістычным спаборніцтве. Па яго выніках В. Козыравай, А. Давыдавай, В. Жыжэнка прысвоена званне «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва».

Сёлета мы справіліся з усімі задачамі па аказанню шэфскай дапамогі калгасу «Дняпровец» Лоеўскага раёна. Вырасцілі добры ўраджай буракоў на плошчы 12 га, нарыхтавалі 150 т. сена. Камсамольцы адпрацавалі ў падшэфнай гаспадарцы 1424 чалавека-гадзіны. Назваць лепшых цяжка. Усе працавалі па-ўдарнаму!

«...Стрыжнем эканамічнай палітыкі становіцца справа, здавалася б, простая і вельмі будзённая, — гаварыў на XXVI з'ездзе КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў, — гаспадарчыя адносіны да грамадскага дабра, уменне поўнасцю, добрасумленна выкарыстаць усё, што ў нас ёсць...

Эканоміка павінна быць эканомнай — такое патрабаванне часу».

Гэтыя словы добра зразумелыя кожнаму камсамольцу, усім маладым праектыроўшчыкам, якія пастаянна імкнуцца да зніжэння каштарыснага кошту праектуемых аб'ектаў. Кожны малады спецыяліст дамагаецца максімальнай эканоміі чарцёжнай паперы, калькі і іншых матэрыялаў, беражэ выкарыстоўваемую тэхніку і абсталяванне.

У гонар XIX з'езда ВЛКСМ нашы камсамольцы ўзялі сацыялістычныя абавязацельствы па павышэнню прадукцыйнасці працы, вырашылі на 3,6 працэнта забяспечыць зніжэнне кошту будаўніцтва праз праектаванне, за кошт ашчадных адносін да матэрыялаў на кожным рабочым месцы дабіцца эканоміі сродкаў на 1150 рублёў. У падшэфным калгасе адпрацуем не менш 1600 чалавека-дзён.

Упэўнена, што нашы камсамольцы дастойна сустрэнуць XIX з'езд Ленінскага камсамола.

**Л. ДЗЕРАВЯНКА,**
**сакратар камітэта камсамола Гомельскага філіяла інстытута «Белкалгаспраект».**

## НА ВАЖНЫХ АБ'ЕКТАХ

Як да сапраўднага вялікага свята, рыхтуюцца да XIX з'езда ВЛКСМ камсамольцы БУ-47. Яны заняты на ўсіх аб'ектах, якія вядзе будтрэст № 14. Плітачнікі, гэта значыць мы, надаюць ім такі выгляд, які гамяльчане прывыклі бачыць. Наша праца ўскладзена на такіх аб'ектах тэлефонна-тэлеграфны ўдзел сувязі, цырк, спартыўны манеж, кінатэатр «Юбілейны», кафэ «Маладзёжнае» і на многіх іншых.

Цяпер у нас два асноўныя аб'екты. Гэта новы будынак абкома партыі і драмтэатр. Сёлета яны будуць здадзены ў эксплуатацыю. Работа на этых аб'ектах складаная і патрабуе высокай кваліфікацыі. Нашы рабяты С. Ляшчынскі, В. Мядзведзеў, І. Курыкін і іншыя камсамольцы выконваюць нормы на 120—140 працэнтаў пры высокай якасці.

Мы ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 60-годдзя СССР і падтрымалі ініцыятыву брыгады тынкоўшчыкаў А. Гладзінай: «Заданне шасці месяцаў 1982 года — да дня адкрыцця XIX з'езда ВЛКСМ».

З поўнай упэўненасцю за нашых камсамольцаў магу сказаць, што ўзятае абавязацельства будзе выканана з гонарам.

**Р. ТРАЦЦЯКОЎ,**
**плітачнік БУ-47 будтрэста № 14.**

## ПАВЯЛІЧВАЕМ ВЫПУСК АБУТКУ

У абутковае вытворчае аб'яднанне «Гомельабутакбыт» я прыйшла пасля заканчэння ТВ-20. Спачатку працавала ў цэху індпашыву. Норму выпрацоўкі выконвала на 120—130 працэнтаў. Два гады назад мне прапанавалі ўзначаліць групу апрабацыі. На гэтым участку працуе 16 чалавек, сярод якіх — 2 камуністы і 4 камсамольцы. За прайшоўшы час выпуск абутку мы павялічылі амаль у два разы. На ўчастку за кожным маладым рабочым замацаваны вопытны настаўнік.

**Н. КНЫШАВА,**
**кіраўнік групы апрабацыі АВА «Гомельабутакбыт», дэлегат канферэнцыі.**

*Увага: навіна*

## СТУДЭНЦКАЕ БЮРО ПЕРАКЛАДАЎ

Час навукова-тэхнічнага прагрэсу ставіць перад вучонымі задачы, для вырашэння якіх недастаткова ведаць толькі дасягненні айчыннай навукі ў нейкай канкрэтнай галіне. Надзённай неабходнасцю з'яўляецца знаёмства з працамі замежных вучоных. У сувязі з гэтым вялікае значэнне набывае ўменне чытаць і перакладаць замежную літаратуру.

Пры кафедры АМАЭІ працуе студэнцкае бюро перакладаў, якое аказвае важкую дапамогу па азнаямленню з навуковай літаратурай на англійскай мове. У рабоце прымаюць удзел студэнты, якія не толькі добра ведаюць англійскую мову, а і дысцыпліны асноўнага вучэбнага курса. Зараз члены бюро І. Раманюк, Л. Сыранкова (0-41), Л. Малажаўская (0-42), С. Грыбкова, Л. Дзмітрыева, (0—32), Г. Ільюшчанка (Т-24) занятыя перакладам цыкла артыкулаў з амерыканскіх часопісаў, які прысвечаны даследаванню аперацыі. Кваліфікаваны пераклад, які зробяць студэнты, дазволіць азнаёміцца з асноўнымі напрамкамі работы амерыканскіх эканамістаў, вывучыць метады рашэння некаторых агульных праблем прымянення даследавання аперацыі ў эканоміцы.

Няма сумнення і ў тым, што глыбокае веданне англійскай мовы, якое несумненна набудуць студэнты ў час работы ў бюро перакладаў спатрэбіцца будучым інжынерам - эканамістам у іх практычнай рабоце і ў навуковых даследаваннях.

**М. ФРЭЙДЛІНА,**
**выкладчыца кафедры англійскай мовы.**
**Г. ШЭЛЯЛЯЕВА,**
**малодшы навуковы супрацоўнік кафедры АМАЭІ.**

## МОЛАДЗЬ І СПОРТ

Цэнтральны раён Гомеля багаты спартыўнымі традыцыямі. У ім неаднаразова праводзіліся міжнародныя, усесаюзныя і рэспубліканскія спаборніцтвы па розных відах спорту.

Раённая фізкультурная арганізацыя налічвае ў сваіх радах звыш 40 тысяч чалавек. У сацыялістычным спаборніцтве сярод раёнаў горада на лепшую пастаноўку фізкультурна-масавай, аздараўленчай і спартыўнай работы Цэнтральны раён быў узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў.

За мінулы год і дзесяць месяцаў бягучага года ў раёне падрыхтавана 45 майстроў спорту, 171 кандыдат у майстры, 552 першаразраднікі. Каля 25 тысяч юнакоў і дзяўчат выканалі нарматывы Усесаюзнага фізкультурнага комплексу ГПА.

Многія класы і школы далучаюць да фізкультуры і спорту Усесаюзныя дзіцячыя спартыўныя гульні «Старты надзей». Летась у іх прыняло ўдзел больш чатырох тысяч школьнікаў. Зборныя каманды раёна неаднаразова выходзілі пераможцамі і прызёрамі гарадскіх і абласных спаборніцтваў па такіх відах спорту як лыжы, валейбол, футбол, лёгкая атлетыка, мнагабор'е комплексу ГПА, заваёўвалі прызы клубаў «Скураны мяч» і «Залатая шайба».

У Цэнтральным раёне добрая спартыўная база: два стадыёны, плавальны басейн, 33 спартыўныя залы, 8 ціраў, 8 лыжных баз, больш ста спартыўных пляцовак.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Рэктарат, партком, мясцком, кафедра фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны выказваюць спачуванне дацэнту гэтай кафедры КУЗНЯЦОВУ Віктару Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета ЛКСМБ и профкома Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 20838
Заказ 6885